*ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!*

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА
БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

1981
1
ВЕРАСНЯ
АЎТОРАК
№ 25 (1325)
Выходзіць раз у тыдзень.
Цана 2 кап.

## УКАЗ

### ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА СССР АБ УЗНАГАРОДЖАННІ ОРДЭНАМІ І МЕДАЛЯМІ СССР РАБОТНІКАЎ ВЫШЭЙШЫХ І СЯРЭДНІХ СПЕЦЫЯЛЬНЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ МІНІСТЭРСТВА ВЫШЭЙШАЙ І СЯРЭДНЯЙ СПЕЦЫЯЛЬНАЙ АДУКАЦЫІ СССР.

**ЗА ДАСЯГНУТЫЯ ПОСПЕХІ Ў ВЫКАНАННІ ЗАДАННЯЎ ДЗЕСЯТАЙ ПЯЦІГОДКІ ПА ПАДРЫХТОЎЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ ЎЗНАГАРОДЗІЦЬ:**

**ОРДЭНАМ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ**

Прытыцкую Таццяну Іванаўну — загадчыцу кафедры Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

**ОРДЭНАМ ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА**

Івашына Уладзіміра Рыгоравіча — прарэктара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

Чыгіра Васіля Фёдаравіча — дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

**ОРДЭНАМ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ**

Лойку Алега Антонавіча —прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Раманоўскага Мікалая Тарасавіча — дэкана факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна, прафесара.

**ОРДЭНАМ «ЗНАК ПАШАНЫ»**

Барышэўскага Уладзіміра Рыгоравіча — прафесара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Малевіча Ігара Аляксандравіча — загадчыка лабараторыі Навукова-даследчага інстытута прыкладных фізічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ ДОБЛЕСЦЬ»**

Ананька Валянціну Паўлаўну— загадчыцу аддзела бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Брыгадзіна Пятра Іванавіча — сакратара камітэта ЛКСМБ Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Гапоніка Паўла Мікалаевіча — старшага навуковага супрацоўніка Навукова-даследчага інстытута фізіка-хімічных праблем Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Казлоўскага Мікалая Іванавіча — начальніка навукова-даследчага сектара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**МЕДАЛЁМ «ЗА ПРАЦОЎНУЮ АДЗНАКУ»**

Маркаву Валянціну Георгіеўну —галоўнага бухгалтара Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Аўсяніка Мікалая Кузьміча — майстра вучэбна-вытворчых майстэрань Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна

Прокашаву Веру Акімаўну — асістэнта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

**Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**Л. БРЭЖНЕЎ.**
**Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР**
**М. ГЕАРГАДЗЭ.**

Масква, Крэмль.
17 чэрвеня 1981 г.

## ШЧАСЛІВАЙ ДАРОГІ, ПЕРШАКУРСНІК!

ДАРАГІ СЯБАР! Сёння ты стаў членам вялікай дружнай сям'і, імя якой — савецкае студэнцтва. Здзейснілася твая запаветная мара — вучыцца ў Беларускім ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўным універсітэце імя Уладзіміра Ільіча Леніна. Табе выпаў гонар змяніць учарашніх выпускнікоў, якія пяць гадоў высока неслі сцяг нашага слаўнага універсітэта, а сёння з дыпломамі і ведамі высокакваліфікаваных спецыялістаў працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі, пашыраюць гарызонты навукі, сеюць «разумнае, добрае, вечнае». Дык дазволь павіншаваць цябе з гэтай падзеяй і пажадаць вялікіх поспехаў у вучобе, нястомных пошукаў і знаходак на карысць нашай Савецкай Радзімы.

1981 год — своеасаблівы для кожнага з нас. Універсітэт рыхтуецца адзначыць свой шасцідзесяцігадовы юбілей. Увесь гэты час БДУ імя У. І. Леніна па праву лічыцца флагманам беларускай вышэйшай школы. Бадай нельга назваць такое прадпрыемства ці ўстанову, інстытут, тэхнікум ці школу, дзе б не працавалі нашы выпускнікі. Яны заўжды ў першых радах будаўнікоў камуністычнага грамадства, браліся за самую складаную справу і з поспехам выконвалі яе. Ганарыся гэтым, сённяшні першакурснік, будзь варты іх!

Сваё шасцідзесяцігоддзе калектыў універсітэта сустракае новымі поспехамі ў вучобе і грамадскай дзейнасці. Пацверджанне таму— Пераходны Чырвоны Сцяг Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і ЦК прафсаюза работнікаў асветы, вышэйшай школы і навуковых устаноў, якім БДУ імя У. І. Леніна ў другі раз запар узнагароджаны за высокія паказчыкі ў сацыялістычным спаборніцтве сярод ВНУ краіны. Гэта надае кожнаму з нас яшчэ больш сіл, энергіі, абавязвае працаваць лепш і лепш, каб з поспехам рашаць новыя велічныя задачы, што паставіў XXVI з'езд КПСС.

Вучыцца ва універсітэце, які носіць імя вялікага Леніна,—не толькі пачэсны гонар. Гэта яшчэ і вялікая адказнасць. Старанна вучыцца, настойліва ўзбагачаць свае веды лепшымі здабыткамі чалавечага розуму — галоўны абавязак кожнага студэнта. Спадзяемся, што ты, дарагі сябар, будзеш прытрымлівацца гэтага правіла і сваёй нястомнай працай над падручнікам і канспектам, у чытальнай зале і аўдыторыі з першых дзён вучобы апраўдаеш высокае званне савецкага студэнта. А веды, якія ты атрымаеш у сценах універсітэта, спатрэбяцца табе ў далейшай працы, будуць надзейным памочнікам і дарадчыкам у жыцці.

Кожны твой дзень павінен быць днём напружанага, нястомнага пошуку. Зрабіць яго такім табе дапамогуць твае старэйшыя сябры— выкладчыкі.

Не толькі вучобай жыве студэнт. За пяць гадоў ты набудзеш шмат верных сяброў, навучышся цаніць сапраўдную дружбу, апранеш форму будатрадаўца. А колькі цікавых сустрэч і знаёмстваў, лекцый і канцэртаў чакае цябе наперадзе! Нас будзе толькі радаваць тое, што ты прымеш самы непасрэдны ўдзел у шматгранным жыцці БДУ імя У. І. Леніна. Вучыся працаваць з людзьмі, адстойваць перадавое, змагайся з усім тым, што перашкаджае нам жыць і будаваць, будзь сапраўдным патрыётам сваёй Радзімы!

Перад савецкім народам стаіць грандыёзная задача — пабудаваць новае, камуністычнае грамадства. А ты, сённяшні першакурснік,—малая часцінка шматмільённага атраду будаўнікоў камунізму, іх надзейная змена. Шчаслівай дарогі табе, дарагі сябар!

**РЭКТАРАТ**
**ПАРТКОМ**
**МЯСЦКОМ**
**КАМІТЭТ КАМСАМОЛА**
**ПРАФКОМ**



ТЫ ПРАЗ СТАГОДДЗІ БУДЗЕШ НЕСЦІ
БЯССПРЭЧНЫ СВОЙ АЎТАРЫТЭТ,
МОЙ ДЗЕД, МОЙ БАЦЬКА, МОЙ РАВЕСНІК,
МОЙ СЯБРА — УНІВЕРСІТЭТ!

## Віншуем з пачаткам навучальнага года, сябры!

# ПРАНЯСІЦЕ ПРАЗ ГАДЫ

## ХТО ТЫ, ПЕРШАКУРСНІК?

**ЗВЕСТКІ АБ ПАСТУПАЮЧЫХ У БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА НА ДЗЕННАЕ АДДЗЯЛЕННЕ**

**ПЛАН ПРЫЁМУ — 1950 ЧАЛАВЕК.**
**ПАДАДЗЕНА ЗАЯЎ — 4324.**
**ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН (РАЗАМ З ПА) — 3010**

**1. ПАРТЫЙНАСЦЬ:**
**ЧЛЕНЫ КПСС — 100, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 86;**
**ЧЛЕНЫ ВЛКСМ — 4204, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 2913.**
**2. САЦЫЯЛЬНЫ САСТАЎ:**
**РАБОЧЫЯ І ДЗЕЦІ РАБОЧЫХ — 1956, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 1272;**
**КАЛГАСНІКІ І ДЗЕЦІ КАЛГАСНІКАЎ — 408, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 272;**
**СЛУЖАЧЫЯ І ДЗЕЦІ СЛУЖАЧЫХ — 1960, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 1466.**
**3. НАЦЫЯНАЛЬНАСЦЬ: БЕЛАРУСЫ — 3137, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 2151;**
**РУСКІЯ — 847, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 630;**
**ІНШЫЯ НАЦЫЯНАЛЬНАСЦІ — 340, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН —229.**
**4. МЕДАЛІСТЫ (УСЯГО): — 791, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 628,**
**МЕДАЛІСТЫ ШКОЛЫ — 630, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 567;**
**СКОНЧЫЛІ ТЭХНІКУМ З АДЗНАКАЙ — 90, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 34;**
**СКОНЧЫЛІ ГПТВ І ТВ З АДЗНАКАЙ — 71, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 27.**
**5. МЕСЦА ЖЫХАРСТВА:**
**г. МІНСК — 1348, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 987;**
**З ІНШЫХ ГАРАДОЎ БССР — 1486, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 963;**
**З СЕЛЬСКАЙ МЯСЦОВАСЦІ — 1205, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН —879;**
**З ІНШЫХ РЭСПУБЛІК — 285, ВЫТРЫМАЛА ЭКЗАМЕН — 181.**

## Жадаем вам...

**А. М. РУХЛЯ, САКРАТАР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА:**

Шырокае поле шматграннай грамадскай дзейнасці чакае вас, першакурснікі. Правядзенне Тыдняў паспяховасці, арганізацыя дыскатэк і сустрэч з вядомымі дзеячамі навукі і літаратуры. Ужо каторы год дзейнічае пошукавая група «Доўг»... Нам усюды патрэбны ваша актыўная жыццёвая пазіцыя, ваша настойлівасць. А яшчэ хацелася б запрасіць ва універсітэцкія будатрады. Універсітэцкі зводны будатрад — лепшы ў рэспубліцы. Камітэт камсамола ўпэўнены, што ты не застанешся ў баку, а апранеш таксама зялёную куртку. Пабудзеш на новабудоўлях Беларусі і Карэліі, палях Малдавіі і Стаўраполля...

Студэнты універсітэта ў час канікулаў адпраўляюцца ў «зорныя» паходы па месцах баявой і працоўнай славы савецкага народа, праводзяць паходы выхаднога дня. Самыя дужыя і смелыя ўдзельнічаюць у водных паходах па горных рэках, абжываюць вяршыні Урала і Паміру, Карпат. Дзесяткі розных спартыўных секцый прымуць вас у свае рады. Многія студэнты нашага універсітэта з'яўляюцца членамі зборных каманд рэспублікі, краіны, прызёрамі і пераможцамі розных чэмпіянатаў.

Каму, як не вам, сённяшнім першакурснікам, працягваць слаўныя традыцыі папярэднікаў, рашаць задачы, пастаўленыя XVIII з'ездам ВЛКСМ.

**М. М. ДРОЗД, СТАРШЫНЯ ПРАФКОМА:**

Адной з самых шматлікіх грамадскіх арганізацый універсітэта з'яўляецца прафсаюзная. Уся яе дзейнасць прасякнута клопатам аб вас, дарагія першакурснікі. Яшчэ вы толькі пераступілі прыступкі універсітэта, аб вас ужо ведаюць, аб вас клапоцяцца. Тут і клопат пра ваша здароўе, пра ваш будучы быт і адпачынак. Інтэрнат, дзе вы пражываце студэнцкія гады,— другі дом, у якім шмат цікавага і вясёлага. У інтэрнаце № 6 адкрыты клуб-кафэ, курсы шыцця і кройкі працуюць ў інтэрнаце № 2... Пералічваць можна доўга. Круглы год адкрыты міжвузаўскі прафілакторый, які размешчаны ў сасновым бары пад Мінскам. Тут можна паправіць сваё здароўе, проста добра адпачыць. Летам на возеры Нарач дзейнічае спартыўна-аздараўленчы лагер, адзін з лепшых у краіне.

Мы чакаем вас, першакурснікі, ў прафкоме, прафсаюзных бюро факультэтаў, студсаветах інтэрнатаў з каштоўнымі прапановамі наконт арганізацыі ўмоў працы, быту і адпачынку!

**У. М. МАКАРЭВІЧ, ДЫРЭКТАР СТУДЭНЦКАГА КЛУБА МАСТАЦКАЙ САМАДЗЕЙНАСЦІ:**

Нашы новыя сябры, напэўна, ужо чулі пра славуты ансамбль танца «Крыжачок», студэнцкі тэатр. Вас таксама чакаюць народная харавая капэла, аркестр народных інструментаў, вакальна-інструментальны ансамбль. Працуюць шматлікія гурткі мастацкай самадзейнасці, тэатр паэзіі на філфаку, тэатр мініяцюр на хімічным факультэце... Ва ўсім гэтым вы, першакурснікі, самі упэўніцеся. Усё гэта ў вас наперадзе.

**І. У. АРЭХОЎСКАЯ, ДЫРЭКТАР БІБЛІЯТЭКІ:**

Адно з першых месц, куды прыходзіце вы, першакурснікі, бібліятэка. І мы рыхтуемся да гэтай сустрэчы асабліва ўважліва. Нам хочацца, каб усе тыя веды, што змяшчаюць у сабе 1 мільён 700 тысяч экзэмпляраў кніг бібліятэкі, перайшлі да вас.

Аднак гавораць, што студэнт — гэта не посуд, які напаўняецца абы як, а першым чынам — факел, які патрэбна запаліць. Мы дапамагаем у гэтым. У сваю чаргу, мы хочам бачыць чытача актыўным, добрасумленным, каб ён не заставаўся ў баку ад дыспутаў і канферэнцый, якія праводзіць бібліятэка. Каб першакурснік не разгубіўся ў кніжным акіяне падручнікаў і дапаможнікаў, мы заўсёды прыйдзем на дапамогу. Параім, што лепш выбраць. Хацелася б, каб ён, наш новы чытач, які толькі пераступіў прыступкі універсітэта, з павагай ставіўся да кожнай кнігі.

Запісаў
М. ЛАХВІЧ.

## АДЧЫНІ запаветныя ДЗВЕРЫ

— ШАБУНЯ! — праляцела прозвішча над натоўпам абітурыентаў, што запоўнілі калідор каля 377-й аўдыторыі, дзе дэкан філалагічнага факультэта А. А. Волк разам з некалькімі супрацоўнікамі праводзіў субясяданне з апошнімі групамі тых, хто паступаў на рускае аддзяленне.

У аўдыторыю адна за другой увайшлі дзве дзяўчыны, што здзівіла прысутных:

— Хто вы?

— Шабуня.

— А вы?

— Таксама Шабуня.

Аляксей Арсенцьевіч зазірнуў у паперкі:

**РЭПАРТАЖ З СУБЯСЕДАВАННЯ**

— Каторая з вас Наталля?

— Я.

— Сядайце.

Дзяўчыне з такім жа прозвішчам прапанавалі крыху пачакаць.

І вось ужо Наталля расказвае пра сябе. Скончыла школу ў 1979 годзе ў Гродна, працавала тэхнічным сакратаром у рэдакцыі газеты. Чаму не пайшла на журфак? Спадзяецца, што філалагічны факультэт у галіне мовы дасць значна больш.

З ёй, безумоўна, згаджаюцца і раяць рыхтавацца да 1 верасня. Колькасць балаў у яе дастатковая для таго, каб быць залічанай ва універсітэт.

Трэці раз здавала ўступныя экзамены на філалагічны факультэт Марыя Дзяргай. Набрала такую ж колькасць балаў, як і ў мінулым годзе, але сёлета яна «стажніца» (два гады працавала дзяўчына на вытворчым аб'яднанні «Прамень»). Калі Марыю павіншавалі з паступленнем, яна не стрымала радасных эмоцый:

— Я паступіла? Гэта дакладна?

— А вы што, не спадзяваліся?

— Спадзявалася, але... я так доўга чакала гэтага...

Пасля «стажнікаў» да стала дэкана факультэта выклікаюцца ўчарашнія школьнікі. На ўсе пяцёркі здалі ўступныя экзамены Яўген Махоцін і Ігар Панамарэнка. З задавальненнем адзначаюць супрацоўнікі факультэта спартыўныя разрады сваіх будучых студэнтаў. Высвятляецца, што Жэня Махоцін быў рэдактарам і дыктарам школьных радыёперадач.

— Выдатна!—адзначае Аляксей Арсенцьевіч. У нас таксама ёсць свой факультэцкі радыёвузел. Зможаце працягваць любімую справу.

Наталля Давыдчык прыехала паступаць аж з Тбілісі. Чаму? Хацелася вучыцца на радзіме бацькоў, якія, у свой час, закончыўшы інстытут, паехалі з Мінска ў Грузію па размеркаванню. У папцы з яе дакументамі шмат пахвальных лістоў і

## Шлях ад абітурыента—81

**ФОТАІМГНЕННІ**

**Сяргей ЧЫГРЫН,**
**студэнт філфака**

**Абітурыенты,**
**У слове гэтым—**
**Радасць, настрой, хваляванне.**
**Кожны жадае шчаслівых**
**білетаў,**
**Кожны чакае шчаслівае ранне.**
**Абітурыенты!**
**Прыціхлыя, смешныя,**
**Я разумею вас да драбніц.**
**Дома не спіцца —**
**расплюшчылі першымі**
**Вочы — ад светлых крыніц.**
**Абітурыенты.**
**Знешне спакойныя,**
**Вас ужо можна павіншаваць.**
**Вашы адказы проста цудоўныя:**
**Экзаменатары ставяць вам**
**«пяць».**
**Абітурыенты,**
**У слове гэтым —**
**Радасць, настрой, перамога...**
**А за акном — студэнцкае лета:**
**Песня, праца, дарога...**





# ПРАГУ ДА ВЕДАЎ І ПОШУКУ!

дыпломаў. Добрай вучаніцай была Наталля, і ёсць усе падставы стаць нядрэннай студэнткай.

— Можаце смела паведаміць бацькам аб сваім паступленні, — раіць дэкан.

Настаўніцай англійскай мовы працавала ў Брэсцкай вобласці Таццяна Кіта.

— Чаму ж не пайшла ў інстытут замежных моў? —здзіўляюцца прысутныя.

І Таццяна дзеліцца назіраннямі аб тым, што школьнікі, як правіла, рускую мову і літаратуру любяць больш, чым замежную. Ды і сама яна ў душы — аматар рускага слова.

— Што ж, разлічвайцеся з работай і збірайцеся да нас...

Адна за другой уваходзяць дзяўчаты. Баязлівыя і смелыя, упэўненыя і нерашучыя, —розныя, амаль незнаёмыя паміж сабой. Яны сустрэнуцца на першых занятках, пасябруюць на сельгасработах. Выявяцца арганізатарскія здольнасці Святланы Балдышэўскай і спартыўныя — Ірыны Судак. Даведаюцца аднакурснікі, што Алена Чакулаева мае нават дыпломы за надрукаваныя празаічныя творы, Наталля Андрэева спявала ў вакальна-інструментальным ансамблі, а Юрый Мядзведзь — выдатны гітарыст.

Усе гэтыя адкрыцці ў першакурснікаў яшчэ наперадзе. Ім — знаёміцца, ствараць калектыў. А Аляксей Арсенцьевіч ужо зараз, на субяседаванні ўважліва прыглядаецца да заўтрашніх студэнтаў. Дэкан павінен ведаць аб іх усё.

— Выдатны ў гэтым годзе набор. Глядзіце, якія цікавыя дзяўчаты! — звяртаецца Аляксей Арсенцьевіч да калег у той каранценькі перапынак, пакуль сюды, да стала дэкана, выклікаюць чарговую абітурыентку.

— Ціхановіч Алена...

Уважліва прагледзеўшы дакументы, дэкан павярнуўся да сакратара:

— Запішыце: мае асаблівую патрэбу ў інтэрнаце.

Затым звяртаецца да субяседніцы:

— Вы паступілі.

— Дзякуй! А калі прыязджаць.

— Вам прышлюць выклік.

Субяседаванне працягваецца.

**Т. САХАШЧЫК,**
**наш кар.**

## да студэнта БДУ

**ЎСТУПНЫХ ЭКЗАМЕНАЎ**






Фота А. СТАДУБА.

## ПАРА СТАНАЎЛЕННЯ

СТУДЭНЦКІЯ ГАДЫ пакідаюць у памяці кожнага самы светлы, самы цудоўны след. Сапраўды: у студэнтаў значна больш правоў чым абавязкаў. І галоўнае з іх — права на вучобу. Сёння многія забываюць, што гэтым правам трэба даражыць.

Мы ж, студэнты 20-ых, добра ведалі кошт нядаўна заваёваных правоў. Мы прагна цягнуліся да ведаў, дапамагаючы адзін аднаму, чым толькі маглі, убіраючы ў сябе і навуковыя і палітычныя веды. А як жа інакш — даводзілася ж весці прынцыповую і штодзённую барацьбу з варожымі элементамі. І ў гэтай барацьбе мы выхоўваліся самі і выхоўвалі тых, хто побач.

У вас наперадзе яшчэ ўсё жыццё. Крыху пасталеўшы, вы зразумееце, што прыемна не толькі атрымліваць. Аддача — таксама вялікае задавальненне. Але трэба мець, што аддаваць. На назапашанне гэтага вы выкарыстайце гады студэнцтва.

Я віншую сёння ўсіх, хто паступіў ва універсітэт, але найбольш горача, зразумела, тых, хто прыйшоў у матэматыку. Матэматыка, па майму разуменню, блізкая да мастацтва. Тэрміны «прыгожае», «зграбнае» выкарыстоўваюцца і ў нас. А галоўнае, у гэтай навуцы на ўсіх яе этапах абавязкова прысутнічае элемент творчасці. Хто з нас не адчуваў задавальнення ад пошуку ісціны? Хто не рабіў хоць маленькае, але самастойнае адкрыццё?

Усе, хто прыйшлі на факультэт, безумоўна, любяць абраны прадмет. Пажадаю не загубіць на працягу гадоў гэтага пачуцця. Не адступіць перад цяжкасцямі. Матэматыку трэба не толькі ведаць — ёю трэба валодаць.

**ГАННА НАТАНАЎНА НАХІМОЎСКАЯ, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, студэнтка 20-ых гадоў.**

## ЗНАЙСЦІ СВАЁ МЕСЦА

ЗДЗЕЙСНІЛАСЯ МАРА! Палюбіць і ўвайсці ў любімую спецыяльнасць, якая стане для кожнага з вас другім «Я»,—сапраўды знамянальная падзея. Хачу пажадаць кожнаму быць дзёрзкім у навуцы. Зрабіць у ёй свае адкрыцці. У нашым універсітэце ёсць для гэтага ўсе ўмовы, выдатная навуковая і матэрыяльная база.

Наперадзе ў сённяшніх першакурснікаў гады станаўлення. За гэты час яны стануць самастойнымі асобамі, неабходнымі грамадству. І кожны — неабходным па-свойму. Але гэта не так проста — знайсці сваё месца. Патрэбна адукацыя. Патрэбна працавітасць. Хто з маладосці палюбіць працу—зможа ўсяго дасягнуць. Чаго ж прасцей!

Цікавага, незабыўнага, вясёлага студэнцкага жыцця вам, паступіўшыя. Але яго арганізацыя цалкам залежыць ад вас саміх. Мы ў свае гады гэта выдатна разумелі...

**ВОЛЬГА РАМАНАЎНА СКАРАХОД, доктар хімічных навук, прафесар, студэнтка 30-ых гадоў.**

## ПАКІНЬЦЕ ДОБРЫ СЛЕД

ГЭТЫ СВЯТОЧНЫ дзень для кожнага з вас стане і першым днём цудоўнай студэнцкай працы. Перад вамі адкрываюцца новыя гарызонты пазнання свету, усе багацці навукі, назапашаныя чалавецтвам.

Успамінаю свой першы студэнцкі год, 1943, на станцыі Сходня пад Масквой, дзе Беларускі дзяржаўны універсітэт аднавіў сваю работу. 120 юнакоў і дзяўчат, многія з якіх прайшлі суровую школу барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі на фронце, у партызанскіх атрадах, у падполлі, з вялікай стараннасцю селі за парты. Не хапала аўдыторый, кніг, нават паперы для канспектаў. У дачных доміках, якія часова ператварылі ў інтэрнаты, было холадна, няўтульна. Харчаванне было дрэннае. Многім з нас давялося працаваць і вучыцца. Але, нягледзячы на выключна цяжкія ўмовы, сярод нас не было ні скептыкаў, ні ныцікаў. Усе мы жылі адной дружнай сям'ёй. Кожны з нас быў гатовы ў любы момант прыйсці на дапамогу сябру, падтрымаць яго ў цяжкую мінуту. Разам ездзілі на лесанарыхтоўкі, ішлі на донарскія пункты, наведвалі тэатры і музеі.

На камсамольскіх сходах першакурснікаў не прыходзілася разбіраць пытанні аб дысцыпліне або непаспяховасці. Нас хвалявала становішча на фронце, барацьба партызан у тыле ворага, радавала мужнасць савецкіх людзей.

Гарачы водгук атрымала звестка аб зборы сродкаў на танкавую калону «Камсамолец Беларусі». У сэрцы кожнага першакурсніка адчувалася прага да ведаў. Мы разумелі, што добрай вучобай выконваем абавязак перад Радзімай, перад таварышамі на фронце.

Студэнцкія гады — лепшая пара ў жыцці кожнага чалавека, але асабліва прывабліва юнацтва, калі яно сагрэта вялікай мэтай — жаданнем стаць выдатным спецыялістам, пакінуць добры след на зямлі.

**ДАВІД БАРЫСАВІЧ МЕЛЬЦАР, доктар гістарычных навук, прафесар, студэнт 40-ых гадоў.**

## ПРЫМАЙЦЕ ЭСТАФЕТУ

ДАРАГІЯ ПЕРШАКУРСНІКІ! Перад вамі новая старонка жыцця, новы этап. На цэлых пяць гадоў родным і жаданым стане універсітэт. Быць студэнтам такой вядомай ВНУ сапраўды вялікае шчасце.

Перад вамі наперадзе: свет кніг, пазнанне таямніц сваёй прафесіі, эшалоны будаўнічых атрадаў, бяссонныя ночы перад экзаменамі... За гады вучобы ва універсітэце вам прыйдзецца прайсці вялікі і цікавы шлях. Праз пяць гадоў вы станеце гісторыкамі і матэматыкамі, фізікамі і юрыстамі, географамі і хімікамі, біёлагамі і журналістамі. У нас ёсць усе ўмовы для паспяховай вучобы: выдатныя карпусы, чытальныя залы, багатая бібліятэка, лабараторыі і кабінеты. А горад Мінск дае ўсе магчымасці для таго, каб вы змаглі цудоўна правесці свой вольны час.

Я ўспамінаю свой першы дзень ва універсітэце, а было гэта 20 гадоў назад, і вельмі зайздрошчу сённяшнім першакурснікам, якім давядзецца жыць і працаваць у XXI стагоддзі.

Больш чым 2000 выпускнікоў пакінулі сцены нашага універсітэта ў гэтым годзе. Сярод іх сотні выдатнікаў вучобы, актывістаў, ветэранаў студэнцкага будаўнічага руху. Вельмі б хацелася, каб эстафету добрых спраў выпускнікоў кожны з вас пранёс праз усе студэнцкія гады. Вялікіх поспехаў вам, сябры!

**ГЕОРГІЙ ЯКАЎЛЕВІЧ РЫЛЮК, кандыдат геаграфічных навук, дацэнт, студэнт 60-ых гадоў.**

## І АД ЦЯБЕ ЗАЛЕЖЫЦЬ

СТУДЭНТАМ старэйшага ў рэспубліцы універсітэта я стаў у юбілейны год — БДУ адзначаў сваё паўстагоддзе. Факт гэты быў натхняючым для нашага пакалення студэнтаў. Мы адразу ж уключыліся ў вірлівае камсамольскае жыццё, якое стала для кожнага школай выхавання, прывіло навыкі зносін з людзьмі, развіло і замацавала актыўную пазіцыю.

Якім цікавым было наша жыццё! Няхай мы не ўсё ўмелі і ведалі, — мы імкнуліся аб усім даведацца, няхай нават на ўласных памылках.

Крыху раскажу аб сабе. У камсамольскай рабоце прайшоў ад камсорга курса да намесніка сакратара камітэта камсамола універсітэта. Быў пастаянным слухачом факультэта грамадскіх прафесій (чаму б не атрымаць яшчэ адну цікавую спецыяльнасць?). Не абыходзіў спорт. Навуковай работай пачаў займацца з другога курса. Быў лаўрэатам рэспубліканскіх і ўсесаюзных конкурсаў, удзельнічаў у навуковых канферэнцыях. Пералічваю ўсё гэта для таго, каб лішні раз пераканаць, што студэнцкае жыццё для кожнага можа стаць цікавым, насычаным. Але гэта залежыць ад цябе самога.

І галоўнае — памятай, што слаўныя традыцыі твайго і майго універсітэта ствараюцца кожным пакаленнем студэнтаў. Якім будзе наш БДУ праз 10-20-50 гадоў залежыць і ад цябе.

**УЛАДЗІМІР ВІКТАРАВІЧ ПУЗІКАЎ, выкладчык кафедры палітэканоміі прыродазнаўчых факультэтаў, студэнт 70-х гадоў.**

ПРАЦУЮЧЫ Ў АТРАДАХ У АДЗІНЫМ СТРАІ З РАБОЧЫМІ І КАЛГАСНІКАМІ, СТУДЭНТЫ І НАВУЧЭНЦЫ НАБЫВАЮЦЬ ВОПЫТ КАЛЕКТЫЎНАЙ ПРАЦЫ І ТВОРЧАСЦІ, ЗАМАЦОЎВАЮЦЬ НА ПРАКТЫЦЫ АТРЫМАНЫЯ ВЕДЫ, ВЫХОЎВАЮЦЬ У СЯБЕ АКТЫЎНУЮ ЖЫЦЦЁВУЮ ПАЗІЦЫЮ. ШТОГОД АДНАЎЛЯЕЦЦА САСТАЎ АТРАДАЎ, АЛЕ НЯЗМЕННЫМІ ЗАСТАЮЦЦА ТРАДЫЦЫІ САМААДДАНАЙ ПРАЦЫ, ДУХ РАМАНТЫКІ І БЕСКАРЫСЛІВАСЦІ, ДРУЖБЫ І ТАВАРЫСКАСЦІ.

Л. І. БРЭЖНЕЎ.

# ЦЯЖКА—ЗНАЧЫЦЬ ЦІКАВА

ЗАКОНЧЫЎСЯ трэці працоўны семестр для студэнтаў будаўнічага атрада «Мінчане». Сёлета байцы працавалі ў далёкай Якуціі, у пасёлку Сярэбраны Бор. Вельмі капрызным і непастаянным было гэта лета: раніцой сонца, днём дождж, увечары зноў сонца. Але нягледзячы на гэта, на цяжкасці першых дзён, калі прыходзілася, літаральна, перакідвацца з аб'екта на аб'ект, «выбіваць» будматэрыялы і тэхніку, атрад лічыць, што яму пашанцавала, бо давялося будаваць пускавы аб'ект — вадагрэйную кацельню. Будоўля — важнейшая ў Якуціі: кацельня ў канцы верасня павінна даць цяпло Новаму Нерунгры. Таму і работы тут было шмат. У Нерунгры мы нарэшце адчулі сапраўдную працоўную стомленасць і радасць працы. Фронт работ на вадагрэйцы быў пэўны і канкрэтны, за змену мы ўкладвалі па сотні кубоў бетону.



У першым месяцы было нялёгка, прыходзілася перакваліфіцыравацца з адной спецыяльнасці на другую. Але рабяты працавалі на сумленне і хутка, адстаючых не было. Сярод лепшых вызначаліся А. Бацько і С. Пархімчык, вопыт і майстэрства якіх былі прыкладам для ўсіх нашых цесляроў. Упэўнена, кваліфікавана працавалі майстар атрада Сяргей Грышаль, інспектар па тэхніцы бяспекі Ігар Пальцаў,



урач Валерый Мельнічэнка і многія іншыя.

Кожны баец знайшоў сваё месца ў атрадзе. Дзякуючы рабоце моцнага, баявога актыву мы заўсёды былі на перадавой.

СБА «Мінчане» перавыканаў свае дагаворныя абавязацельствы ў два разы, асвоіўшы больш 300 тысяч рублёў капіталаўкладанняў. Два аб'екты здадзены са студэнцкім знакам якасці, пададзена 2 рацпрапановы, усе брыгады працавалі па метаду брыгаднага падраду, укараняючы асабістыя рахункі эфектыўнасці і якасці.

Вельмі дапамагло нам у працы індывідуальнае сацспаборніцтва, разгорнутае ў атрадзе, і спаборніцтва з камсамольска-маладзёжнымі брыгадамі Нерунгрынскай ГРЭС. Спаборніцтва стала стымулам у правядзенні грамадска-палітычнай работы. Байцы дапамагалі ветэранам вайны і працы, шэфствавалі над школай, дзіцячым садам, піянерскім лагерам. Працаваў кансультацыйны пункт, дзе нашы студэнты займаліся падрыхтоўкай мясцовай моладзі да паступлення ў ВНУ і тэхнікумы.

Добра была наладжана і спартыўная работа. Мы правялі больш 30 сустрэч па футболу, валейболу і баскетболу, шашках і шахматах. Плённа працавала лектарская група, якая прачытала для жыхароў і будаўнікоў каля 30 лекцый. 36 стэндаў для нагляднай агітацыі зрабіў школе, падшэфнаму інтэрнату наш атрадны мастак У. Касцюкевіч з сябрамі.

Вялікім поспехам карысталася кожнае выступленне атраднай агітбрыгады, якая старалася да кожнага канцэрта падрыхтаваць нешта новае, цікавае, каб задаволіць слухачоў. Вясёлымі і захапляючымі сталі праведзеныя ў атрадзе дні дзяўчат, конкурс «А ну-ка, хлопцы», запомнілася экскурсія па Якуцкім краі.

Гавораць, чым цяжэй жыць, тым цікавей. Мы рады, што прайшлі праз усе цяжкасці. Значыць, жылі цікава.

**В. ГАЙКО,**
**камадзір СБА «Мінчане».**





**НА ЗДЫМКАХ: СБА «Мінчане» на рабочых аб'ектах.**

**Фота аўтара.**

# Да сустрэчы, Сярэбраны Бор!

ДЗЕВЯЦЬ ГАДОЎ назад пачаў сваю біяграфію атрад «Расінка». А адбылося ўсё вельмі проста: 30 студэнтак механіка-матэматычнага факультэта засталіся летам у Мінску, каб працаваць на пладова-гароднінай базе роднага горада.

Працоўны дзень пачынаўся вельмі рана, калі на лістоце кустоў і дрэў яшчэ серабрыліся маленькія кропелькі расы. Так і з'явілася паэтычная назва атрада «Расінка». Тады ж уступіла ў сілу асноўная ўмова працы студэнтаў: рабіць усё на сумленне, так, каб пасля заканчэння працоўнага семестра яшчэ доўга ўспаміналі дзяўчат з «Расінкі».

А потым была Малдавія, вёска Копанка Слабадзейскага раёна. На палях калгаса імя У. І. Леніна атрад стаў сапраўдным баявым калектывам.

Ёсць у атрадзе такая традыцыя: у апошні дзень працоўнага семестра ветэраны пішуць свае пажаданні будучаму атраду. А на наступны год на адкрыцці лагера іх зачытваюць на ўрачыстай лінейцы. Якіх толькі шчырых слоў не пачуеш у адрас атрада! «Мілая мая «Расінка»! Я думаю, што магу яе назваць маёй, таму што гэтыя два месяцы перавярнулі ўсё маё жыццё. Я ўпершыню даведалася, што такое сапраўднае сяброўства і хто такія сапраўдныя сябры. Дзякуй вам, дзяўчаты, за ўсё. Няхай не заўсёды ўсё атрымлівалася, было нялёгка. Але мне хочацца пажадаць новай «Расінцы», каб, нягледзячы на ўсе цяжкасці, яна заўсёды заставалася такім жа дружным калектывам, каб студэнтам, якія першы раз трапілі ў «Расінку», было ў ёй цёпла і ўтульна, каб яны адразу адчулі плячо сябра. У добры шлях, «Расінка»!»

Сем гадоў запар не сціхалі на палях малдаўскай вёскі беларускія песні і вясёлы дзявочы смех. Канцэрты і цікавыя лекцыі, бурныя дыспуты і займальныя КВЗ, цёплыя, сяброўскія вечары з мясцовай моладдзю, і, зразумела, цяжкая, але добрасумленная праца — вось гэта запаўняла жыццё атрада два летніх месяцы, вось за што іх так палюбілі і паважалі мясцовыя жыхары.

А сёлета амаль за два месяцы да ад'езду ў Малдавію атраду прапанавалі змяніць месца дыслакацыі. Малы БАМ, Усесаюзная камсамольская будоўля—Нерунгрынская ГРЭС. Прага рамантыкі, жаданне паспрабаваць сябе ў новай справе і паглядзець Сібір, далёкую, прывабную Якуцію, аказаліся мацней.

І вось мінулі цяжкасці і радасці дарогі, прайшоў увесь працоўны семестр. Працавалі, спявалі, верылі... Верылі ў тое, што навучыліся трымаць кельму і пэндзаль так, што кватэры, над якімі мы працавалі, будуць прымаць сваіх жыхароў святлом і ўтульнасцю; у тое, што вясёлыя песні дзяўчат-«расінак» застануцца ў памяці жыхароў пасёлка Сярэбраны Бор. І гэта вера дапамагала нам.

А колькі новых сяброў з'явілася ў «Расінкі»! Мы не развітваемся з імі, не развітваемся з табой, Якуція! Мы гаворым табе: «Да сустрэчы!»

**А. ЧАРНОВА,**
**камісар СБА «Расінка».**

# «НЁМАН» КАЛЯ НЁМАНА

НАШ АТРАД прымаў удзел у будаўніцтве фермы ў калгасе імя Мічурына Стаўбцоўскага раёна. Мы будавалі пажарныя рэзервуары, узводзілі насосную станцыю... За летні час асвоілі шэраг будаўнічых спецыяльнасцей, навучыліся працаваць зладжана, дружна. Бо менавіта ў СБА пазнаецца дружба, калектывізм. Атрад нам дапамог праверыць саміх сябе— на што здольны кожны ў прыватнасці і калектыў у цэлым. Акрамя работы на будоўлі, мы аказвалі дапамогу калгасу ў нарыхтоўцы кармоў.

Праца ў атрадзе спалучалася з умела арганізаваным адпачынкам. Праведзены 4 футбольныя матчы, некалькі сустрэч па валейболу са зборнай камандай калгаса.

Цёпла сустракалі мясцовыя жыхары нашу агітбрыгаду. Яна прымала ўдзел ва ўшанаванні хлебаробаў на свяце першага снапа.

Ад'язджаючы, мы можам сказаць:

— Лета прайшло не дарма. Атрад пакінуў добры след на зямлі адной з перадавых гаспадарак раёна.

**Н. ШМЯЛЕЎСКАЯ,**
**Т. РЫБАЧОНАК.**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ.

1 верасня 1981 г.

Заказ 1372 АТ 02392

220080 МІНСК-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ГЕАГРАФІЧНЫ КОРПУС, п. 14.

ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар

В. П. ВАРАБ'ЁЎ